**СКЛАДАНАЗАЛЕЖНЫ СКАЗ З НЕКАЛЬКІМІ ДАДАНЫМІ ЧАСТКАМІ**, складаназадежны сказ ускладненай будовы, разнавіднасць складаназалежнага сказа, у структуры якога вылучаецца адна галоўная частка і дзве ці больш даданыя. У навуковай літаратуры (П.П. Шуба, Т.Я. Шэмет) такія сказы называюць яшчэ складаназалежнымі сказамі ўскладненай будовы. Асобныя даследчыкі (П.П. Шуба) да складаназалежных сказаў ускладненай будовы адносяць не толькі складаназалежныя сказы з адной галоўнай і некалькімі даданымі часткамі, але і складаназалежныя сказы з адной даданай і некалькімі галоўнымі, а таксама сказы з некалькімі даданымі, якія падпарадкаваны некалькім галоўным: *Там, дзе восень ідзе, лес шумлівы радзее, вецер гоніць хмарыны з-за цёмных ялін* (А. Куляшоў); *А як раніца настане, бліскі сонца загуляюць, – рос прыходзіць адцвітанне, туманы ў рэчцы таюць* (Я. Купала) (гл. **ТЫПЫ СКЛАДАНАЗАЛЕЖНЫХ СКАЗАЎ З НЕКАЛЬКІМІ ДАДАНЫМІ ЧАСТКАМІ**).

Даданыя часткі ў межах складаназалежнага сказа ўскладненай будовы могуць размяшчацца перад галоўнай, якой яны падпарадкаваны (прэпазіцыя), у сярэдзіне галоўнай (інтэрпазіцыя) і пасля галоўнай (постпазіцыя): *Хоць ліў без упынку дождж, хоць людзі, як маглі, стараліся стрымаць агонь, да світання ад трох гумнаў засталіся толькі мокрыя абгаркі…* (С. Грахоўскі); *Маці дайшла да таго ўзгорка, да якога заўсёды праводзіла нас, калі мы ішлі на аўтобус пешкі, спынілася, усё гэтак жа няўпэўнена махала машыне рукой і, мусіць, плакала* (Я. Сіпакоў); *Я да цябе прапісаны, мой край, рачулкай, што ў полі запятляла, сцяжынкай, што з бацькоўскага двара мяне ў жыццё і людзі выпраўляла* (М. Шабовіч).

Большасць складаназалежных сказаў ускладненай будовы не ўяўляюць сабой прынцыпова адрозных канструкцый ад складаназалежных сказаў (няўскладненых). Прэдыкатыўныя часткі іх звязваюцца па тых жа фармальных правілах, што і часткі складаназалежных сказаў, і маюць тыя самыя значэнні. Тым не менш і ў складаназалежных сказаў з некалькімі даданымі часткамі ёсць некаторыя асаблівасці фармальнага і стылістычнага характару, напрыклад, спалучэнне злучнікаў (калі два злучнікі знаходзяцца побач), пропуск злучніка ў другой з аднародных даданых частак. Акрамя таго, само аб'яднанне прэдыкатыўных частак у асобных выпадках мае абмежаванні. Так, напрыклад, сэнсава не сумяшчаюцца і не звязваюцца з адной галоўнай даданая прычыны і даданая выніковая часткі, колькасць даданых азначальных частак таксама не можа быць неабмежаванай, хоць тэарэтычна такая даданая частка можа быць пры кожным назоўніку галоўнай і інш.

*С.С. Мароз*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ